

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў межах штогадовага праекта «Гісторыя і сучаснасць кніжнай графікі» праходзіць выстаўка «Фантастычная вандроўка».

# ФАНТАСТЫЧНАЯ ВАНДРОЎКА



Карэл Чапек. «Вайна з саламандрамі»





Дзмітрый Аганаў. «Міраж у Эгейскім моры»



Іван Арцімовіч. «01001011011010010.../ [Kiss]»



Хрысціна Высоцкая. «Эдэм»



Дапаўняюць экспазіцыю і робяць яе больш відовішчнай і прыцягальнай работы сучасных беларускіх жывапісцаў, графікаў, скульптараў, майстроў дэкаратыўнага мастацтва. На выстаўцы прадстаўлены арыгіналы ілюстрацый да літаратурных твораў, якія інтэрпрэтуюць знакамітыя фантастычныя сюжэты сусветнай культуры.








У экспазіцыі прадстаўлены выданні аўтараў XIX–XX стст., пачынаючы ад вынаходнікаў і стваральнікаў жанру навуковай фантастыкі – Ж. Верна і Г. Уэлса – да іх прадаўжальнікаў і наследнікаў – Я.Перэльмана, А.Бяляева, А.Талстога, К.Чапека, С.Лема, А.Азімава, Р.Брэдберы і інш., да першых знакавых твораў сучаснага фэнтэзі. Выстаўка дае магчымасць параўнаць вобразныя, стылістычныя і тэхнічныя прыёмы ўвасаблення аднаго і таго ж сюжэта рознымі кніжнымі графікамі.





Алена Калеснікава «Душа даспеха».

Выстаўка дае магчымасць наведвальнікам вандраваць з зорак выданняў на планеты твораў, са старонкі на ілюстрацыю, скрозь стагоддзі і кантыненты, спасцігаючы прыгоды вынаходнікаў, капітанаў, касмічных падарожнікаў, незямных істот і экспедыцыі фантастычных народаў і паралельных сусветаў.